# СЕКЦИЯ СЛАВЯНСКОЙ ФИЛОЛОГИИ

***А. В. Анцімонік***
*Навук. кір.* ***М. У. Аммон,***
*канд. філал. нав.*

## СПОСАБЫ МАСТАЦКАГА ЎВАСАБЛЕННЯ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ВІКІ ТРЭНАС

У сучаснай гуманітарнай навуцы паняцце лірычнага героя надзвычай складанае і неадназначнае. Нераўназначнасць аўтара і суб'екта лірыкі асабліва ўскладнілася ў сучасным прыгожым пісьменстве, дзе немалаважную ролю адыгрываюць канцэпцыя смерці аўтара і "гульнёвы" характар функцыянавання сістэмы "пісьменнік-чытач".

Шматварыянтнасць вобраза сённяшняга лірычнага героя можна прасачыць на прыкладзе паэзіі Вікі Трэнас. Так, лірычная гераіня першага зборніка паэткі "Цуд канфіскаванага дзяцінства" – гэта аб'ектывацыя рэальнага "Я" аўтаркі (аўтапсіхалагічная паэзія ў фарбах). Яна не слабая дзяўчынка, якая баіцца монстраў, што могуць цікаваць пад ложкам. Гэта сталасць, сплеценая з юнацтвам; цемра, перакрыжаваная са слабымі промнямі праз зачыненыя вокны. Акаляючыя вобразы выражаюцца словамі тыпу "пекла", "калідоры", "сцены"; "нябёсная столь", "дах". Фізічнае абмежаванне сваёй існасці ў зборніку спалучаецца з бясконцай духоўнай свабодай. Экзістэнцыяльнае пачуццё адзіноты, постмадэрнісцкая адсутнасць выражанага лірычнага "я", супрацьпастаўленне суб'екта лірыкі "іншым" – асноўнае напаўненне "Цуда…".

У другім зборніку паэткі "Экзістэнцыйны пейзаж" больш "самасці", даросласці, самаўпэўненасці і халоднай сур'ёзнасці, літаратурна-паэтычнай самасвядомасці. Самота і хваравітае адчуванне сябе і свету сталі яшчэ больш па-філасофску заглыбленымі і трывалымі. У цэнтры ўвагі лірычнай гераіні другой кнігі знаходзяцца такія паняцці, як "мора", "адлегласць", "смак", "горад". Зборнік насычаны назвамі месяцаў, што падкрэслівае пэўны час і адпаведны настрой. Відавочным выступае факт эвалюцыі лірычнай гераіні Вікі Трэнас, што можна патлумачыць пэўнымі зменамі светапоглядных арыенціраў самой паэткі.

Яскравая рыса суб'екта лірыкі ў цэлым – гарманічнасць. Спецыфічнасць яе праяўлення заключаецца ў тым, што гераіня знаходзіцца, пераважна, у стане смутку, роспачы, самоты, адзіноты і г. д. Але чытач назірае Асобу, унутраны канфлікт якой не даходзіць да катастрофы, а асэнсоўваецца суб'ектам лірыкі, паддаецца абгрунтаванню і аналізу. Заслуга паэткі ў тым, што яна змагла зрабіць лірычнага героя максімальна жывым і сапраўдным. І хоць экзістэнцыйныя праявы ў паэзіі не адкрыццё аўтара, хоць тэмы, якія закранаюцца ў кнізе, не новыя – Віка Трэнас змагла аформіць словы і апрацаваць праблематыку сваіх вершаў на годным узроўні, прапусціўшы іх праз сябе і надаўшы ім шчырае гучанне.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Е. В. Бакунова***
*Науч. рук.* ***Т. А. Осипова,***
*канд. филол. наук, доцент*

## ВЕРБАЛИЗАЦИЯ КОНЦЕПТА «ЖИЗНЬ» В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ В. В. НАБОКОВА

В нашей работе мы определили особенности вербализации концепта «жизнь» в прозе В. Набокова (на материале романов, повестей и рассказов «Лолита», «Другие